Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 7 (552). Wilnia, Niadziela 11 Lutaha 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	„Biel. KRYNICA“ kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Ідэолёгічны падзел сярод б. грамадаўцаў.

(Ад нашага баранавіцкага карэспандэнта).

Абсэрвуючы жыцьцё Баранавіцкага павету і далейшых ваколіц, можна заўважыць вялікі ідэолёгічны падзел пасярод быўшых грамадаўцаў.

Калі была «Грамада», яна захапіла бадай увесь наш павет і, трэба сказаць праўду, пацягнула за сабою масы. «Грамада» ў сваей дзейнасьці выстаўляла на чало ўсіх дамаганьняў соцыяльныя патрэбы беларусаў і апроч гэтага моцна адзначала сваю арыентацыю на Расею. На нацыянальныя патрэбы беларусаў, як народу, «Грамада» зварочвала мала ўвагі, ішло ей перадусім аб тое, каб скамунізаваць масы, каб кінуць гэтыя масы ў абняцьці Масквы, а тагды — ўсё будзе добра...

Ясна, што такая праграма „даразнага“ ратунку не магла даць беларускаму народу трывалых, позытыўных рэзультатаў. Праўда, народ мясцамі скамунізаваўся, пачаў аглядацца на Маскву, як на сваю заступніцу, пачаў арганізавацца, думаючы, што ўсходні „дзядзька“ заразжа падасьць руку помачы і наступіць доўга-чаканае шчасьце. Тымчасам праходзілі месяцы і гады і „шчасьце“ ня прыходзіла. Болей таго, прыйшло няшчасьце, бо польскія турмы пачалі напаўняцца сотнямі і тысячамі няшчасных людзей, якія так і не дачакаліся помачы з усходу і абяцанай «перамены».

Што ўсе гэныя абяцанкі былі толькі пустым словам, найлепш відаць цяпер, пасьля заключэньня дружбы паміж Саветамі і Польшчай і пасьля арышту павадыроў «Грамады» ў Менску. Цяпер многім адкрыліся вочы на ўсю фальшывасьць тагачасных абяцанак, але тагды ім верылі. І ня толькі верылі, але йшлі нават у турму і цярпелі за іх. Калі на гэтае запаўняньне польскіх турмаў зварочвалі ўвагу арыштаваных цяпер у Менску павадыроў «Грамады», то яны заяўлялі, што „гэта нічога, што ідуць у турмы, там прынамсі навучацца, як рабіць рэвалюцыю!“

І праўда, некаторыя яшчэ і дагэтуль «вучацца» ў польскіх турмах, як рабіць рэвалюцыю, некаторыя-ж ізноў ,,вучацца“ гэтага самага ў савецкіх турмах, а доля беларускага народу асталася такою самаю, цяжкою і безпрасьветнаю.

Павадыры ў польскіх і савецкіх турмах, а для народу што? Нічога! І гэта прымусіла людзей зьмяніць свае пагляды на ,,Грамаду“.

Зьмена паглядаў адбываецца ўсьцяж. Да апошняга часу можна было падзяліць быўшых грамадаўцаў на тры групы: 1) такіх, якія выракліся са страху ўсякай палітыкі і кажуць, што «мая хата скраю, нічога ня знаю»; 2) такіх, якія зусім сталіся камуністымі і сябрамі КПЗБ і 3) такіх, якія перайшлі ў польскую санацыю. Гэтае зьявішча можна было спаткаць на вярхох, пасярод б. павадыроў «Грамады», і ў нізох, пасярод сялянскай гушчы. Два апошнія кірункі (г. зн. камуністы і польска-беларуская санацыя) пачалі памі-ж сабою заўзятую барацьбу.

Спытае хто, чаму дзейнасьць «беларускай» „Грамады“ давяла да такіх сумных рэзультатаў? Чаму яна не дала змагароў за свой народ і за свае ідэалы, а за чужыя? Чаму яе актыўныя групы пайшлі на службу чужым і чужой палітыцы?

А сталася гэта таму, што «Грамада» была заснавана чужынцамі і з чужацкімі мэтамі; яна не давала народу нічога позытыўнага беларускага; яна не прабуджала ў народзе нацыянальнай гордасьці; ня вучыла яго, як здабываць лепшую долю сваімі ўласнымі, беларускімі сіламі; яна не дала яму моцных эканамічных асноў праз коопэрацыю і сваё гаспадарчае жыцьцё, а яна навучыла наш народ аглядацца на «дзядзькоў», якія прынясуць яму шчасьце.. Вось будуць рэзультаты дзейнасьці „Грамады“! Гэтыя рэзультаты паглыбілі гістарычны падзел у народзе на «Маскву» і «Варшаву», выявілі нястачу свайго нацыянальнага і гаспадарчага жыцьця, далі народу нейкае палітычнае бязвольле — і навучылі служыць чужым.

Астаткі гэтакіх сумных рэзультатаў відаць ня толькі ў старэйшых адзінках, але і пасярод моладзі. Нядаўна мне здарылася гаварыць з гадунцом Віленскай Бел. Гімназіі. Гаворачы з ім, я ня мог надзівіцца ягонаму «нацыянальнаму ўсьведамленьню». Цьвярдзіў ён паміж іншым, што беларушчына—гэта «ерунда», што яна толькі распалівае нацыяналізм, што лепш чытаць лекцыі або рэфэраты ў польскай ці расейскай мове, што вучні Віл. Беларускай Гімназіі ў большасьці дзяржацца гэтакіх паглядаў і г. д. Спытаўся я ў яго, ці хоць адзін паляк або расеяц адказаўся калі ад сваей мовы ў імя інтэрнацыянальных ідэалаў і пачаў чытаць лекцыі і рэфэраты, напрыклад, у беларускай мове? На гэта мне той „маладзец“ нічога не адказаў, бо й ня меў чаго адказаць, але гэта знак, што дзейнасьць пана Астроўскага, разам і грамадаўца і санатара, прыносіць «пажаданыя» плады: яго гадунцы ўважаюць, што чытаньне лекцыяў пабеларуску — гэта нацыяналізм, а чытаньне папольску ці парасейску – гэта ўжо ня ёсьць нацыяналізмам. — Палітыка служэньня не бяздольнаму беларускаму народу, а сільным гэтага сьвету пераходзіць ад „узгадаваўцы“ да гадунцоў. Такое «ўзгадаваньне» дае беларускаму народу ня стойкіх барацьбітоў, а слуг і рабоў нашым дужым суседзям.

Такое самае «ўзгадаваньне» дала і „Грамада“. Дзеля гэтага ўсе лепшыя сыны нашага народу, зразумеўшы цяпер пахібы „Грамады“, а так-жа ўбачыўшы на дзеле, якое «шчасьце» далі Саветы павадыром грамадаўскага руху, стараюцца цяпер узыйсьці на дарогу сыстэматычнай і пляновай працы на карысьць не «дзядзькоў», але свайго Беларускага народу, іншымі славамі—ўзыходзяць на свой народны шлях. Такім парадкам з быўшых сяброў „Грамады“ творыцца яшчэ адзін кірунак — народніцкі.

Баранаўскі.

Гарэлка — вораг народу.

(З нагоды «Тыдня Цьвярозасьці»).

2—9 лютага сёл. году — гэта „Тыдзень Цьвярозасьці“. У гэты час бадай усе цывілізаваныя народы праз адпаведныя свае арганізацыі, а так-жа розным іншым спосабам, праводзяць ідэю цьвярозасьці. П'янства, як і ўсякае іншае зло, у большай ці ў меншай меры ёсьць усюды і ўсюды сьведамыя гэтага людзі ваюють з ім.

Гісторыя чалавецтва вуча нас, што людзі ад раніцы свайго культурнага развою ўжо знал і адураючыя сродкі, да якіх належа і алькаголь. П'юць людзі алькаголь сьпярша пераважна затым, што ён, адураючы розум, пазваляе ім забыцца аб шэрым штодзенным іх жыцьці, а пасьля, калі людзі да алькаголю прывыкнуць, п'юць яго, бо ня могуць устрымацца.

Найлягчэй п'янства пашыраецца там, дзе пануе цемната і недастатак культуры. Дзеецца гэта затым, што цёмныя людзі не разумеюць тых страшных скуткаў, якія з сабой прыносіць чалавеку п'янства.

На вялікі жаль, справа цьвярозасьці сярод беларусаў у нашым краі выглядае ня добра. П'янства ў нас пашырана значна. Ува ўсей Польскай Рэспубліцы выглядае яно тэтак: у 1930 31 г. людзі прапілі мільярд злотых, у 1931-32 — 820 мільёнаў, у 1932-33 — 640 мільёнаў. П'янства, як бачым, у мінулым годзе ў Польскай Рэспубліцы зьменшылася, але ўсёжтакі прапітых было аж 640 мільёнаў злотых. Гэта знача, што на кожнага грамадзяніна прыпадае якіх 20 зал. у год, а калі ўзяць сям'ю, прыкладам з пяці чалавек, дык на сям'ю ў год выпадае сто зал. прапітых. Але не забываймо, што ў гэтым ліку няма самагонкі, якой людзі сяньня ў многіх мяйсцох проста заліваюцца, а калі-б палічыць, на сколькі яе выпіваецца, дык вышла-б на асобу ня дваццаць зал. у год, а значна больш.

І няма што сябе пацяшаць, што гэныя лічбы больш стасуюцца да іншых народаў у Польшчы, чым да беларусаў. Знаем нашую вёску і і сьмела можам цьвердзіць, што ў справе п'янства беларус не канечна мае быць на апошнім канцы. Розныя сямейныя ўрачыстасьці, а асабліва вясельлі і разбой на іх нашай моладзі, вымоўна аб гэтым гавораць!

Тымчасам як-жа вялікую шкоду робіць алькаголь нашаму народу! Цямната страшная залягае беларускае сяло, — мала там чытаюць газэт і кніжак, мала рупяцца аб палепшаньне гаспадаркі, ня думаюць аб поступе духовым і матэр'яльным, бо ня маюць на гэта ўсё грошаў. Так, ня маюць беларусы грошаў на тое, ад чаго залежыць лепшае жыцьцё іх, будучыня народу, а ёсьць грошы на гарэлку, якая руйнуе душу і цела беларуса і лепшую будучыню народу.

Час, вялікі час, зьвярнуць нам увагу на справу барацьбы з п'янствам сярод нашага народу і на справу пашырэньня сярод яго цьвярозасьці. На жаль, дагэтуль няма ў нас дзеля гэтай мэты адумысловых арганізацыяў, дык няхай на ніве народнай цьвярозасьці працуюць самі сьвятлейшыя нашы вяскоўцы і няхай ім дапамагаюць нашы інтэлігенты, спатыкаючыся з вясковым насельніцтвам.

Першай баявой задачай гэтай працы — зьяўляецца пашыраньне сьведамасьці сярод беларускага народу аб страшэннай шкоднасьці гарэлкі для жыцьця нашага духовага і матэр'яльнага і заахвочваньне да цьвярозасьці.

М. Б.

Гляньце праўдзе ў вочы!

(Ад нашага карэспандэнта з Слоніма).

У нумары 22 віленскага „Słowa“ з 24.I.1934 г надрукавана карэспандэнцыя Галіны Гэрубовічавай пад загалоўкам „Dwie kartki ze Słonimszczyzny“. У гэтай карэспандэнцыі пані Гэрубовічова, апісваючы аб слонімскім паўстанцу 1863 г. Лукашэвічу, піша і аб сучасных настроях нашага сялянства.

Гэная панячка або не змагла дагледзіць настрояў сярод беларускага праваслаўнага сялянства Слонімшчыны, або баіцца глянуць праўдзе ў вочы і піша, каб зака-

лыхаць і сябе і сваіх аднадумцаў.

З гэтай карэспандэнцыі даведваемся, што ў Слонімшчыне полёнізацыя беларускага насельніцтва йдзе поўнай парай, а тлумачыць гэта пані Г. раптоўнай прыхільнасьцяй беларусаў да польшчыны. Паводле пісаніны пані Г. ужо польскія вучыцялі не запісваюць беларускіх дзяцей, што яны беларускай народнасьці, бо зьмяніўся кірунак урадавай палітыкі ў гэтай справе. Цьвердзіць так-жа пані Г., што беларускае сялянства, асабліва моладзь, проста масава запісваецца ў польскія арганізацыі, бо ўжо моцна пранялася польшчынай і польскай культурай

На жаль для пані Г. — ня тое ёсьць у жыцьці, што ў фантазіі. Каб убачыць сапраўднасьць, трэба з адвагай глянуць праўдзе ў вочы. А гэная праўда выглядае гэтак:

Настроі сялянства ў Слонімшчыне да польшчыны агулам шырока і глыбока апазыцыйныя. Не малыя яшчэ бродзяць па нашых сёлах сымпатыі да Масквы; падтрымліваюць гэтыя ўплывы К.П.З.Б. нелегальна з аднаго боку і легальна маскалі папы—з другога боку. Між гэтымі двума сіламі, між сабою варожымі, але згоднымі ў кірунку маскоўленьня душы беларускай, змагаецца з полёнізацыяй і русыфікацыяй нацыянальна-адраджэнскі рух.

Гэтага апошняга пані Г. не дагледзіла, а можа і відзець ня хоча, цьвердзячы, што прад гэтым здаралася, калі вучыцель падчас перапісу насельніцтва запісваў усіх беларусамі, бо гэткі настрой быў быццам у гары, але цяпер усё зьмянілася і зьмяніўся настрой у гары.

Магчыма, што ў гары настрой і зьмяніўся (хоць прыхільным да нас ніколі і ня быў) але ў нізох, сярод беларускага сялянства, апазыцыйны настрой адносна польшчыны не зьмякчэў, бо ў сапраўднасьці паглыбіўся.

Дык глядзем праўдзе ў вочы, хоць яна часамі каму бывае і няпрыемнай.

Ігнат Зарубец.

Sprawa ćwiarozaści ŭ Niezaležnaj Litwie

Jak wiedama, ad 2 da 9 lutaha siol. h. prypadaje „Tydzień Ćwiarozaści“. Z pryčyny hetaha tydnia, wilenskaja litoŭskaja hazeta „Vilniaus Rytojus“ (Nr. 9, 31.I. siol h.) padaje cikawyja wiestki ab pracy na niwie baraćby z alkaholem i pašyrańnia ćwiarozaści ŭ Niez. Litwie. Uwažajem, što paznańnie henaj pracy budzie karysnym i dla nas i dziela hetaha wiestki henyja z uspomnienaj hazety pieradrukoŭwajem dasłoŭna.

...„Jak wiedama, — piša „Viln. Ryt.“, — u Litwie pieršy pačaŭ zmahacca z pjanstwam biskup Valančius. Było heta 75 hadoŭ tamu. U hetym časie pjanstwa ŭ Litwie było duža zakaraniŭšysia. Badaj u kožnym dwary, miastečku i na rastajnych darohach byli karčmy, kudy zachodzili litoŭcy i tam pili dzień i noč. Byŭ heta sapraŭdy strašny čas. Tady — z adnaho boku litoŭcy pierarablalisia na rasiejcaŭ i palakaŭ, a z druhoha — niščyli swajo zdaroŭje i tanuli ŭ biadzie i niastačy.

Ale biskup Valančius nia padaŭ ducham. Wynaradaŭleńnie litoŭskaha narodu jon spyniaŭ knižkami ŭ litoŭskaj mowie, jakija sam pisaŭ i wydawaŭ, a pjanstwa pieramahaŭ kaścielnymi bractwami ćwiarozaści, jakija zahadaŭ ksiandzom zakładać u kožnaj parafii. Hetymi bractwami była pakryta ŭsia Litwa. Rasiejskija čynoŭniki, pany i žydy nia wiedali, što rabić. Rasiejcy pracu biskupa Valančius'a prabawali spynić, ale nie mahli, bo biskup prawodziŭ hetu pracu na hruncie kaścielnym; jaho ideja ćwiarozaści była apiorta na nawucy Chrysta, jaki źjaŭlajecca najwyšejšym uzoram ludzkoha žyćcia.

Urešcie ŭspakoilisia ŭsie worahi biskupa Valančius'a. Pieršyja ŭcichli pany. Bačačy pryhožyja płady pracy na niwie ćwiarozaści, jany sami pačali kasawać karčmy pa swaich dwaroch i rastajnych darohach. Pierastali spraciŭlacca i rasiejcy, bo mudraja palityka biskupa razbroiła ich. I takim čynam dla sprawy ćwiarozaści litoŭskaha narodu było šmat zroblena. Cwiarozaść u Litwie z tych časoŭ siańnia padziŭlajuć usie litoŭskija susiedzi. Ab hetym siańnia pišuć nawukowyja pracy i pawodle henych uzoraŭ jašče i ciapier u Litwie prawodzicca ideja ćwiarozaści.

Pa śmierci biskupa Valančius'a ćwiarozaść u Litwie jašče doŭha žyła. Urešcie 25 hadoŭ tamu było tam zasnawana „Tawarystwa Ćwiarozaści“, jakoje pracuje až da siańnia. Zachadami hetaha tawarystwa ciapier u Niez. Litwie praca ćwiarozaści prawodzicca praz Kaścioł, presu, arhanizacyju, škoły, konferencyi, schody, lekcyi, wystaŭki i h. d. Ciapier tawarystwa heta wydaje dla darosłych tydniowik „Sargyba“ (Straž), nawukowy žurnał „Alkoholizmo pagrindai“ (Asnowy Alkoholizmu) i dla dziaciej „Žvaigždute“ (Zorka). Apračа hetaha „Tawarystwa Ćwiarozaści“ robić zachady, kab litoŭski ŭrad wydaŭ zakony, jakija brali-b u wabaronu siemji alkaholikaŭ i ich majemaść i kab toj-ža ŭrad pamoh tawarystwu zbudawać dla alkaholikaŭ sanatoryju lakarniu.

U 75 tyja ŭhodki śmierci biskupa Valančius'a i ŭ 25 yja ŭhodki zakładzinaŭ „Tawarystwa Ćwiarozaści“ ŭ kancy 1933 h. ŭ Koŭnie byŭ sklikany pieršy kanhres starońnikaŭ ćwiarozaści. Na kanhresie byli prysutnyja: biskupy, ksiandzy, prafesary ŭniwersytetutu i duža mnoha tak ludziej. Miž inšym kanhres pryniaŭ hetkija rezalucyi: 1) rabić zachady, kab jaknajchutčej byŭ wydany zakon, jaki spyniŭby pjanstwa, 2) kab wučyciali ŭ škołach hadawali moładź u duchu ćwiarozaści i arhanizawali hurtki ćwiarožnikaŭ, 3) wyhaniać alkahol z usiakich haścin, 4) barocca z tajnym wyrabam alkaholu i z pradažaj jaho, 5) kab padčas „Tydnia Ćwiarozaści“ zusim nie pradawali alkaholnych napitkaŭ, 6) kiraŭniki moładzi pawinny paznajomicca z tym, jakoje maje značeńnie ŭ wychawańni dziaciej pjanstwa i ćwiarozaść, 7) ksiandzy pawinny rabić statystyku, pakazwajučuju pałažeńnie pjanstwa i ćwiarozaści ŭ parafii, apiakawacca ćwiarožnikami i zakładać bractwy ćwiarozaści.

Z nahody kanhresu ŭ Koŭnie była tak-ža naładžana wystaŭka. Tam było pakazana, jak pryhataŭlać ježu, kab ludzi mienš pili, jakuju suwiaź alkahol maje z prastupkami ludziej, jak jon asłablaje wieru, niščа zdaroŭje, wyciskaje ludzkuju kroŭ, ślozy i niščа ŭwieś kraj. Taksama na wystaŭcy było pakazana, jak wyrablać roznyja napitki biez alkaholu“...

Jak bačym, my biełarusy sapraŭdy šmat čaho karysnaha možam nawučycca na niwie ćwiarozaści ad susiedniaha nam litoŭskaha narodu.

M. K.

Z Sojmu i Senatu.

Polskaja sojmawaja apazycyja pa śla boju pačała rukami machać. Sojmawaja bolšaść (B.B.) u minułym m-cy skarystała z niearhanizawanaści dy raspoŭzłaści sojmawaj apazycyi i prawiała nowuju konstytucyju. Apazycyjnyja pasły abo nia byli na hetym pasiedžańni Sojmu, abo budučy ŭ Waršawie zaniaty byli swaimi sprawami. Dziela hetaha ŭ Sojmie padčas hałasawańnia za źmienu konstytucyi było stolki pasłoŭ, što Klub B.B. stanawiŭ adpawiedny lik hałasoŭ, kab źmianić Konstytucyju i Konstytucyju źmianili. Ciapierža apazycyja ahledziłasia i pačynaje damahacca pierahladu hetaj sprawy, kab dabicca pierahałasawańnia Konstytucyi; apazycyja tady ŭžo sabrałasia-b na hałasawańnie i ŭ Klubie B.B. nie chapiła-b adpawiednaha liku hałasoŭ dziela źmieny Konstytucyi. U hetaj sprawie na apošnim pasiedžańni Sojmu z boku apazycyi byli prapanowy skasawańnia niekatorych pastanoŭ hałasawańnia za źmienu Konstytucyi dziela taho, što źmiena Konstytucyi prawiedziena niefarmalna. Ale darma, prapanowa heta hałasami B.B. adkinuta.

Na pasiedžańni senackaj Kamisii ministar zahranićn. spraŭ Bek skazaŭ pramowu, u jakoj padsumawaŭ zdabyčy polskaj zahraničnaj palityhi. Z asabliwym zadawaleńniem min. Bek zaznačyŭ ważnaść dla Polščy faktu zbližeńnia z Sawietami i z Niamieččynaj.

Hitler ab Piłsudzkim

i polska-niamieckim dahawory.

Paśla zaklučeńnia miž Polščaj i Niamieččynaj dahaworu ab nienapadańni praz 10 hadoŭ, kancler Niamieččyny Hitler skazaŭ u Rejchstahu pramowu, u jakoj miž inšym zajawiŭ, što Niamieččyna i Polšč musiać zhadzicca z faktam, što žywuć u susiedztwie. Niamiecki ŭrad, z wiedama pawadyra polskaha narodu, maršała J. Piłsudzkaha, zaprapanawaŭ polskamu ŭradu pačać pierahawory, jakija dawiali da zaklučeńnia dahaworu. Niamiecki narod witaje heny dahawor i wyjaŭlaje achwotu supracoŭnictwa z Polščaj tak ža i ŭ ekanamičnaj halinie.

Мы і яны.

Яшчэ сьвежа ў памяці многіх, як нядаўна польскі народ, разарваны і прыгнечаны варожымі сіламі, рваўся да незалежнага жыцьця і ўтварэньня самастойнае дзяржавы. Гэраічнае змаганьне польскага народу за свае правы выклікала глыбокае спачуцьцё сярод цывілізаваных народаў сьвету. Асабліва спагадалі яму славянскія народы, якія гэтак сама цярпелі ў чужацкае няволі Аружныя паўстаньні польскага народу, разыходзячыся голасным рэхам па славянскіх землях, будзілі адвагу і веру ў паняволеных славянскіх братох. І ня дзіва, калі наш слаўны паўстанец Кастусь Каліноўскі, б'ючыся побач з палякамі, змагаўся за волю і незалежнасьць сваей Бацькаўшчыны. А колькі-ж гарачых сэрцаў і сьветлых галоў, сёньня нікому няведамых палягло ў паўстанчых радох за тую ж Маці Беларусь-Літву, ідучы за сваім атаманам, для нас несьмяротным — Каліноўскім. І хаця паўстаньні былі задушаны перамогшаю грубою сілаю, аднак ані сьмерць на шыбельніцах і ссылкі на катаргі не запужалі змагароў і ня спынілі іхнае барацьбы за сьветлыя ідэалы вызваленьня паняволеных народаў. Пахаваўшы зброю ад перамогшага і разьюшанага маскаля для сваіх патомных, ня зморанна распачалі работу, мо' і больш важную, як аружнае змаганьне, — пашыраючы сьведамасьць сярод гаротнага селяніна і работніка. І калі вялікі сын нашае Бацькаўшчыны — Міцкевіч — заклікаў сваім чароўным словам у польскае мове народ да веры і трываласьці, дык пасьля тое-ж рабілі ўжо ў беларускае мове нашыя слаўныя песьняры Бурачок і Марцінкевіч. І здавалася, што гарманійнае сужыцьцё паляка з беларусом ніколі не засмуціцца, бо маючы перад сабою супольнага ворага, лепшыя сыны Польшчы працавалі з лепшымі сынамі Беларуска-Літоўскае Старонкі. І ў бурлівыя дні расейскае рэвалюцыі 1905 году, калі зазіялі першыя праменьні свабоды, гінуў беларус побач з паляком, росячы сваёй крывёй рэвалюцыйныя барыкады. Біліся і гінулі разам, бо лучыла гэтых славянскіх братоў супольнасьць ідэалаў — воля і незалежнасьць. Уміраючы на барыкадах, гінучы ў сырых казэматах і лютае сібірскае катарзе, закладалі трывалы фундамант згоды і прыязьні на будучыню.

Але нядоўга зіяла сонца свабоды. Чорная рэакцыя, бязьлітасна задушыўшая рэвалюцыю, засланіла сонца цёмнымі хмарамі. І гэтыя цёмныя хмары пачалі завалакаваць і беларуска-польскае сужыцьцё. Паміж дзьвёх варожых сілаў апынуўся беларускі адраджэнскі рух. Расейская чорная сотня ў асобах „тоже бѣлорусса“ Солоневича ў Вільні і „истинно-русскаго“ Шмидта ў Менску — з аднае стараны і „тутэйшага“ пана-абшарніка — з другой, бачылі ў праявах беларускага вызваленчага руху бунт. Калі штаб „усердствующих“ Солоневичей і Шмидтов у гэным „бунце“ бачыў „польскую интригу“, маючую на мэце апалячваньне і далучэньне „искони русских земель сѣверозападнаго края“ да будучае польскае дзяржавы, дык панска-абшарніцкія мазгі ўглядалі у вызваленчае працы сапраўдны бунт, датуль пакорнага белага нявольніка-беларускага селяніна. Калі лепшыя сыны паняволенай Польшчы — польская дэмократыя—і былі пакуль што верны дружбе беларусу, дык польская эндэцыя і, ішоўшы на яе павадку, польскі клер ненавідзелі беларускае адраджэньне, аплёвываючы ўсё тое, што было сьвятым для беларускага народу. Мары аб граніцах 72 году, у якіх жадалі бачыць будучую Польшчу, не давалі ім супакою. Адкідаючы этнографічныя прынцыпы, ня лічучыся з узростам нацыянальнае сьведамасьці, пёрліся пад Маскву, уважаючы Беларуска-Літоўскія землі за „rdzenne polskie kresy“, насельніцтва якіх паводле шовіністычнае думкі розьнілася ад палякоў толькі „gwarą“. Добра сарганізаваная пры помачы клеру, поўная дастаткаў, тагачасная эндэцыя, адкідаючы романтызм, консэквэнтна праводзіла праз двары, тайныя школы і касьцёл полёнізацыю беларускага сялянства. Гэта яны ўсупалцы з палякуючымі ксяндзамі „ахрысьцілі“ каталіка беларуса ў „польскую веру“, а мову беларускую зьвялі да „простае“ — хамскае, каб яе абрыдзіць.

Але і польская дэмократыя — лепшыя сыны Польшчы, — у меру ўзросту нацыянальнае сьведамасьці беларускага народу, пакрысе пачалі пераглядаць свае адносіны да беларускае проблемы. Калі спачатку разглядаўся беларускі адраджэнскі рух, як нешта бязладнае і безнадзейна слабое, зрадзіўшаеся ў галовах беларускае народніцкае інтэлігенцыі, дык польская дэмократыя ў імя „дэмократычных прынцыпаў“ толеравала праявы беларускага руху, яшчэ няшкодзячага польскае палітычнае думцы і дапамагаўшага хоць і ў незначнае меры аслабляць Расею. Але пасьля, калі беларускае адраджэньне пачало прыбіраць рэальныя формы, выяўляючы незалежніцкія імкненьні беларускага народу, ідучы ўжо не па лініі жаданьняў польскіх палітыкаў, дык „лепшыя сыны“, зрэвідаваўшы свае адносіны да беларускага пытаньня, прынялі больш асьцярожны і халодны тон, не разрываючы вонкава дружбы з піонэрамі беларускага руху ў імя тых-жа „дэмократычных прынцыпаў“, і, яўна ня шкодзячы беларускаму адраджэньню, стараліся аднак гэты рух падпарадкаваць і скіраваць на шлях сваіх жаданьняў. Шлях-жа гэты ў канечнай сваей мэце ні ўчым ня розьніўся ад шляху польскае шовіністычнае думкі, бо вёў ён проста ў Варшаву, толькі з тою розьніцаю, што „лепшыя сыны“ сулілі сваім „меншым“ братом-беларусам нешта нявыразнае ў будучыне, — тагды, калі будзе ўтворана польская дэмократычная дзяржава, а іхныя палітычныя ворагі— шовіністыя, нічога ня сулячы, памагалі расейскае чорнае сотні душыць беларускі рух.

Калі ў паветры павеяла вайной, на якую толькі народ пакладаў вялізарныя надзеі, польскія палітычныя партыі, у тым ліку і дэмократы, менш за ўсё цікавіліся беларускае проблемай. І нельга іх было вінаваціць за гэтую няўважлівасьць, бо калі гарыць свая хата, дык аб чужой ня думаецца. Але і беларусы былі заняты падзеямі, папярэджваючымі сусьветную буру, гэтак сама спадзяючыся, што яна разарвець і разгоніць цёмныя хмары расейскае рэакцыі. Сочым за тагачаснымі падзеямі. Было відавочна, што зьбліжаючаяся вайна прысьпяшыць развал згангрэнаванае масы, якою была даваенная расейская імпэрыя і што з мамэнтам развалу расейскага колёсу — адкрыюцца новыя пэрспэктывы і магчымасьці для паняволеных Расеяй народаў. *(д. б.)* *А. П—іч.*

Hoład i epidemija tyfusu.

Niaraz my pisali ab pahrozie hoładu ŭ Dzisienščynie, Brasłaŭščynie i ŭ druhich pawietach Wilenščyny. Ciapier, jak padaje polskaja štodziennaja presa i na padstawie piśmiennych pawiedamleńniaŭ u našu hazetu z miascoŭ zahrožanych hoładam, śćwiardžajem jašče raz, što pałažeńnie tamašniaha žycharstwa wielmi hroznaje. Mnohija daŭno ŭžo prymirajuć hoładam, bo nie dajadajuć, aščadžajučy, kab dažyć da wiasny, a nikatoryja ŭžo i susim nia majuć čaho ješci. Na hetym tle šyracca chwaroby, asabliwa tyfus. Na pahraniččy hałodnym i chworym nasielnictwam apiakujecca wojska: padkormliwajuć z wajskowych kuchniaŭ, a wajskowyja lekary lečać biaspłatna chworych.

Miajscowaja pomač haładajučym i chworym niedastatačnaja, užo treba pomačy šyrejšaj.

Wuličnyja demanstracyi i adstaŭka ŭradu ŭ Francyi.

Hetymi dniami ŭ Francyi wielmi niespakojna. U Paryžy i prawincyjanalnych haradoch adbywajucca wialikija demanstracyi. Ułady palicejskaj siłaj starajucca ŭtrymać paradak i ład. U wyniku hetaj baraćby jość zabityja i sotni ranienych. Pad naporam apinii demanstrujučych masaŭ lewicowy ŭrad na čale z premjeram Deladier padaŭsia ŭ adstaŭku. Nowy ŭrad arhanizuje b. prezydent Doumergue, jaki zajawiŭ, što nowy ŭrad pawinien być uradam narodnaj jednaści.

Armija pracy ŭ Niamieččynie.

Jašče ŭ 1932 hodzie paŭstała ŭ Niamieččynie instytucyja słužby pracy, ale nie prymusowaja. Henaja słužba pracy zasnawana dziela prywučeńnia šyrokich masaŭ da pracy ziemlarobskaj. Ciapier henaja słužba pracy zawodzicca prymusowa i kožny mužčyna, končyŭšy 19 hadoŭ, budzie zmušany adbyć słužbu pracy ziemlarobskaj, jak abawiazak dziaržaŭny. Kolki budzie henaj słužby—hod, dwa ci try,—pakulšto nie ŭstanoŭlena. Hetkim sposabam Niamieččyna maje pazbycca biezrabotnych i pawialičyć uradžajnaść i płošču ziamli dla ziemlarobstwa. Prymusowaj słužbaj ziemlarobskaj pracy niamiecki ŭrad maje zdabyć dla ziemlarobstwa 14 miljonaŭ hektaraŭ nowaj ziamli, a imienna: asuška bałot drenami dašć 8 miljon. hekt., asuška padmočanych hruntaŭ — 2 miljon. hekt., pustyry i piaski — 1 miljon. hekt., komasacyja — 3 miljon. hekt., — razam 14 miljonaŭ hektaraŭ.

Henaje pašyreńnie ziemlarobskaj płoščy asielić na ziamli 1.200.000 asob ziemlarobaŭ. Heta budzie mieć dadatny ŭpłyŭ na niamiecki handal i promysł, ale samo ziemlarobstwa pawysić swaju pradukcyju na 2 z paławinaj miljardaŭ marak u hod. Apradča hetaha — wykanańnie takoha planu źlikwiduje armiju biezrabotnych, jakaja budučy bieskarysnaj, kaštuje dziaržawie wialikija hrošy. Kožny taki žaŭnier pracy maje kaštawać dziaržawie 2 marki dzienna. Treba wiedać, što i kožny biezrabotny mała mienš kaštuje, a karyści nijakaj z jaho niama.

Słowam, plan wialiki i niaprosty, jak jon zrealizujecca, pabačym.

Piśmy z wioski.

Treba publikacyi zakonaŭ.

W i š n i e w a, Wialejskaha paw. Naš narod šanuje zakony, ale trebuje, kab i jaho šanawali. Bywała daŭniej, kali pajawicca jaki nowy zakon, dyk ab im tłumačać u wołaści, publikujuć, wywieśwajučy na ścienach, a nawat prysyłali nadrukawany ŭ wiosku. A ciapier nia toje. Prykładam—samaŭradawyja wybary adbylisia ŭ nas, jak u miachu. Wybarnaha zakonu prad wybarami nichto z našych wiaskoŭcaŭ i ŭ wočy nia bačyŭ. Hetyja napisanyja zakony byli tolki ŭ „peŭnych“ ludziej. Dziela hetaha adbylisia i wybary biez hałasawańnia, bo sialanie našy nia wiedali, jak pa zakonu treba rabić śpiski kandydataŭ i ahułam, jak pawinny adbywacca wybary. Dziela hetaha-ž i takoje ahúlnaje niezdawaleńnie z wybaraŭ, što paćwiardžajuć tysiačnyja podpisy pad pratestami, skirawanymi da wybarčych orhanaŭ i dziaržaŭnaj administracyjnaj ułady.

S. B.

Namahajucca apalačyć.

N o w y P a h o s t, Brasłaŭskaha paw. U nas palakoŭ miajscowych niama. Stałyja žychary ŭ nas amal usie biełarusy; jość krychu maskaloŭ starawieraŭ i dzie-nia-dzie polski šlachcic na asadzie. Pryježžych palakoŭ tak-ža krychu jość: u hminie dwuch-troch znajdziecca, u škole wučycieli palaki i na pastarunku palicyi. Rešta žycharstwa—heta biełaruskaje mora ludziej. Biełaruskich arhanizacyjaŭ ani adnaje, a polskich dyk i pieraličyć trudna: stralec, S.M.P., Z.M.W. i jašče niejkija. A ŭ hetych arhanizacyjach namahajucca biełaruskuju moładź pierarabić na świadowych palakoŭ. Namahańni hetyja adnak nadaremnyja, bo naša moładź polonizacyi nie paddajecca i krytyčna adnosicca da hetych arhanizacyjaŭ i ich kiraŭnikoŭ. U hetaj baraćbie pamahaje nam „Bieł. Krynica,“ jakaja ŭžo stwaryła kadry baraćbitoŭ za swajo rodnaje biełaruskaje.

Dyk wypiswajma „Bieł. Krynicu,“ čytajma jaje i pašyrajma, a jana nam pamoža wyjści na lepšy świetły šlach.

K. K.

Вясковае жыцьцё.

Д а ў г і н а в а, Вялейскага пав. Пісаць з беларускай вёскі ў горад—рэч ня вельмі лёгкая. Калі напісаць, што ў нас, на вёсцы, жывецца добра, — дык і гэта будзець праўда, бо здараецца каму-некаму пра бяду забыцца, галаву сабе замарочыўшы. Калі-ж напісаць, што тут жывецца дрэнна, сусім блага, дык і гэта будзець праўда, бо ў большай часьці людзей дрэнна, блага жывецца, а з іх шмат хто сёлета з голаду падцягнуў бакі і палічыў робры. А калі напісаць, што нуд на тут жывецца, — дык і гэта будзець праўда, бо няма добрага жыцьця, няма і пацехі з жыцьця. А калі напісаць, што тут весяла жывецца, дык і гэта будзець праўда, бо няма таго дня, каб мы тут не сьмяяліся хоць праз сьлёзы.

А гэта здараецца тады, як да нас, на вёску, прыяжджаюць госьці, няпрошаныя госьці, а завуцца яны тутака бічунамі. Вось-жа сьмяёмся тады, калі пан „Сельскікатар“ прыехаўшы у вёску да Лявона і зайшоўшы да яго ў хату бачыць яго пяцёра дзетак, з іх палавіна галапузых, а на стале крыха бульбы. Хлеба ў хаце ані крышанькі... І тады, як гэны пан Сельскікатар шукаець нечага пад печай ў Лявонавай хаце, а Лявоніха— гледзячы на ягоную працу — сьмяецца, аж жывот ей трасецца. Сьмех бярэць і сьведкаў, бож ведама ім, што Лявона іншыя паны трасьлі ды трасцу нашлі: атопкі ад добрых людзей для яго дзяцей.

Пасьмяяліся во ня так даўно і дзеля другой прыгоды. Прыехаў той „Сельскікатар,“ але ўжо да Антона Прыехаў, ведама чаго: спаганяць астаткі. Нюхаў, шнырыў па хаці Антонавай,—нічога годнага ня мог знайсьці.

— Ты, баба, нейдзе маеш палатно. Дзе яго схавала?—зьвярнуўся ён сярдзіта да Антосіхі,—зараз! жа пакажы, дык будзець лепш.

У бабы і сьлёзы ў вачах паказаліся і жаль па губах прабег, бо губы задрыжэлі.

— Хочаш паглядзець, праканацца?—з крыкам адазвалася Антосіха. І доўга ня думаючы, адвярнуўшыся задам да надаедлівага „селькатара“, ды падняўшы сарочку вышэй дазволенага мейсца, кажа яму:

— Ці бачыш там палатно? Толькі прыгледзься добра. Астатні кусок палатна на астатняй сарочцы.

Вед ма, кінуўся ён, „Сельскікатар,“ на бабу, але тая ўцякла з хаты.

А людзям дык сьмеху аж па сягоняшні дзень. Але бабе дык не да сьмеху: кажуць, прыдзецца яшчэ раз на судзе перад „сельскімкатарам“ бараніцца, куды ён яе цягнець за кароткую сарочку.

А. А.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Chto kaža praŭdu? Ministar promysłu i handlu hien. Zarycki ŭ sojmawaj kamisii skazaŭ pramowu takoha źmiestu: 1933 hod byŭ hodam strymańnia pahłybleńnia haspadarčaha kryzysu wa ŭsim świecie. U wialikich dziaržawach nastupiła paprawa. Paprawa zaŭwažwajecca i ŭ Polščy i heta paprawa adbywajecca dalej. Tanieje kredyt, raście budaŭnictwa. Paprawa widać u promyśle naftowym, tekstylnym i žaleznym. A pradstaŭniki žydoŭskaha klubu pas. Rozmaryn i wšechpolskaha Rybarski dakazwali, što kanca kryzysu jašče nia widać.

Ziemlarobskija straty. Polskaja sialanskaja presa abličaje, što ziemlarobstwa ŭ Polščy na adnym zbožžy ŭ 1932 hodzie straciła kala 200 miljonaŭ zł. A straciła dziela taho, što nia dobra naładžany zbyt zbožža.

Dziaržaŭny budžet. Sojmawaja budžetnaja kamisija končyła razhladać budžet Polščy na 1934—35 hod. Akreśleny jon u sumach: dachody — 2.136 254.150 zł. i raschody — 2.184 552 593 zł. Deficyt—48.298.443 zł. Užo budžet razhladajecca na plenum Sojmu i budzie tam da 13 h. m.

Demanstracyja biezrabotnych u Paznani. Nadowiačy ŭ Paznani adbyłasia demanstracyja biezrabotnych; biezrabotnyja ŭ liku niekalki tysiač asob demanstrawali prad uradam pasiarednictwa pracy, a kamunisty prawakawali demanstrantaŭ. U wyniku pajšło da sutyčak z palicyjaj, palicyja puściła ŭ ruch h. zw. biełaje aružža. Rezultaty: 2 palicejskich pabitych i 13 demanstrantaŭ aryštawanych.

46.000 wiaźniaŭ. Padčas razhladu budžetu ministerstwa sprawiadliwaści wyjawiłasia, što ŭ 1933 hodzie było ŭ polskich turmach 46.000 wiaźniaŭ. Ništo sabie armija!

Amnestyja. Hazety padajuć, što ŭ źwiazku z źmienaj Konstytucyi budzie ŭ Polščy abwieščana šyroka abymajučaja palityčnyja prastupstwy amnestyja. Adnak, byccam, nie abymie jana ŭciokšych zahranicu.

Baraćba bandyta z palicyjaj. Kala Łodzi bandyt Janiak, kali jaho akružyła palicyja, praz 10 hadzin nie paddawaŭsia i ŭsio stralaŭ u palicyju; 2 palicejskich ranienych; bandyta ŭziali tak ža ranienaha.

Z ZAHRANICY.

Komintern — palityčny trup? Maskoŭski karespandent „Gazety Polskiej“ Otmar piša: Ciapierašni Komunistyčny Internacyjanał jość užo palityčny trup. Heta instytucyja ŭžo dla S.S.R.R. nie patrebna.

Hetyja ćwierdžańni Otmara nia susim padobny da praŭdy, bo kamunisty biez Kominternu ŭ buržuaznych dziaržawach ničoha niawarty. Mahčyma, što Maskwa ciapier prykazała Kominternu ŭspakoicca ŭ Eŭropie, kab nie dražnić buržuazii, z jakoj maskoŭskija kamisary zawodziać družbu i razam spraŭlajuć bankiety, ale na wypadak niazhody Maskwy z eŭrapejskaj buržuazijaj Komintern patrebien dziela apanawańnia proletarjatu, kab hety apošni zmusiŭ swaju buržuaziju bankietawać z maskoŭskimi kamisarami.

Niaŭdały ŭzlot u stratosferu. Specyjalna zbudawany balšawikami balon dziela palotu ŭ stratosfetu, 30 min. m-ca padniaŭsia ŭharu až na 20.620 metraŭ, ale, na žal, zwaliŭsia i raźbiŭsia.

Kali budzie wajna? Rasiejski carski hienerał Denikin niadaŭna ŭ Paryžy pračytaŭ cikawy referat ab budučaj wajnie. Jon zajawiŭ, što byccam wajna pačniecca ŭ 1935 hodzie.

Nacyjanalizacyja zołata. Prezydent Ameryki Rusvelt uwieś čas robić roznyja sproby. Ciapier Ruswelt wydumaŭ nowy plan: jon abjawiŭ, što ŭsio zołata ŭ Amerycy jość dziaržaŭnaje. Usie ŭstanowy i prywatnyja hramadzianie zołata musiać zdać u dziaržaŭny skarb Ad 18.1. s. h. zołata ŭ Amerycy pierastała być płatnaj pryładaj. Hetu rekwizycyju zołata praz dziaržawu nazywajuć nacyjanalizacyjaj zołata.

Narodny pawadyr Sławakaŭ ks. Andrej Hlinka dažyŭ 70 hadoŭ. Praz usio žyćcio ksiondz Hlinka z addanaściaj pracawaŭ dla dabra swajho narodu. Dziela hetaha staŭsia duchowym pawadyrom Sławakaŭ, jakija ŭ 70 yja ŭhodki žyćcia swajho pawadyra ładziać wa ŭsim Kraju adpawiednyja akademii i pastanawili ŭkrapić pamiać Hlinki ŭ narodzie pabudawańniem nowaha kaścioła, dzie Hlinka i ciapier pracuje na dušpastyrskaj niwie. Woś jakuju papularnaść zdabyŭ Hlinka cichaj, ale pozytyŭnaj pracaj dla swajho narodu.

Z KRAJU.

Jak adbirali ŭ sielanina słaninu. Sielaninu Kartaševiču z w. Łapincy, Pałačanskaj hm., treba było płacić padatak, ale nia było hrošaj. Sekwestratar z Maładečna Cybulski apisaŭ za padatak u Kartaševiča słaninu, a kab jaje zabrać, uziaŭ sabie ŭ pomač palicyju. Kartaševič zamknuŭ słaninu ŭ świrnie i dabrawolna nie addawaŭ. Sekwestratar z palicyjaj wywažyli ŭ świrnie dźwiery i zabrali słaninu, a sielanina padali ŭ sud za „bierny“ spraciŭ.

Adsročka płaty daŭhoŭ. Dziaržaŭnyja banki i ziemlarobskija arhanizacyi adsročyli płatu daŭhoŭ nasielnictwu: Brasłaŭskaha, Dzisienskaha i Pastaŭskaha paw. ad 3 da 6 miesiacaŭ. Słabaja heta palohka, ale ŭsiož lahčej.

Z Wilni.

Addzieł sawieckaha turystyčnaha tawarystwa „Inturyst“ maje niezadoŭha paŭstać u Wilni. Metaj jaho—prapahanda i arhanizacyja wyciečak u SSRR.

IV-tyja paŭnočnyja tarhi ŭ Wilni majuć adbycca ŭ 1935 hodzie.

45 wypadkaŭ tyfusu. Pawodle dadzienych sanitarnych uładaŭ Wilenskaha wajawodztwa, u praciahu času ad 28 ha studnia da 3-ha lutaha s. h. na abšary Wilenščyny zanatawany 44 wypadki plamistaha tyfusu i śmiarotnany wypadak brušnaha tyfusu.

Paštowaja skrynka.

Z a r u b i e c. Dziakujem, drukujem, pišycie čaściej. My zhadžajemsia z Wami, što praz Uniju polskija nacyjanalisty chočuć padyjści da dušy biełaruskaj, kab pryščapić polščynu, jak robicca z biełarusami katalikami. Dobra robicie, što prawodzicie akcyju biełarusizacyi carkoŭnaha žyćcia. Ab hetaj pracy ŭ Wašych wakolicach pišycie ŭ Prawasłaŭnuju Kamisiju pry Bieł. Nac. K—cie,—Wilnia, Zawalnaja 1—1.

A w i d a ŭ č u k. Atrymali, dziakujem, skarystajem, ale paprawiŭšy, kab nie papaści pad kanfiskatu i nia zmušać padawać nas u sud, bo heta i kaštoŭna i bieskarysna. Nijaki ksiondz da nas nie źwiartaŭsia i nijakaha z ksiandzom sudu my nia mieli. Kali źwierniecca, dyk dawiedajecca toje, što wiedaje jon i ŭsie wiedajuć.

Š p a k. Apošuimi samaŭradawymi wybarami nacyjanalnaj świedamaści nielha mieryć. Tam biełarus jašče nie razhledziŭsia, a pačakaŭšy i tam pakaža siabie, chto jon.

M a k a r e w i č. Dziakujem, skarystajem. Ničoha što prychodzicca barocca z złom, bo jnakš być nia moža. Prydzie čas, što na padmohu Wam prydzie cełaja armija baraćbitoŭ. Pracujcie, a wyniki pracy buduć.

Z a r e č n i k. Wy nia traćcie enerhii na kałatniu z papom, a lepš prawiadzicie parafijalny plebiscyt, h. zn. — napišycie i źbiarycie padpisy. Tady budziem trebawać źbiełaruščańnia carkoŭnaha žyćcia zhary. Na hetym tle niachaj sabie razharajecca nacyjanalizm, bo jon tut nie napadajučy, a tolki abaronny.

T r u k č y n. Ab kamunistyčnaj biazhłuzdzicy ŭ „Biełhazecie“ i „Litstaroncy“ sapraŭdy niama čaho i pisać, adnak da nas ab hetym pišuć i my, šanujučy swaich karespandentaŭ, drukawać musim. Biazdušnym było b našaje sialanstwa, kab nie adbiłasia ŭ jaho dušy recha aryštaŭ u Miensku? Jasna, što ciapier kamunisty zhubili pasłušnaść u mnohich naiŭnych maładzikoŭ. My zhadžajemsia z Vami, što na miejscy Hramady raście ŭžo wyraznaja biełaruskaja narodnaja świedamaja hramada. Dyk niachaj raście, a prydzie čas i hetaja hramada stworyć arhanizacyju Hramady.

Nr. 1 (10). STUDENSKAJA TRYBUNA 11.II.1934

Palityčny twar biełaruskaha studenstva.

Viedama z navukovaj literatury, asabliva.ž praūna palityčnaj, a tak-ža z abservacyi ruchaū i historyi narodaū, što evolucyja ich pavoli idzie ū kirunku nacyjanalnaj indyvidualizacyi.

U pieršym numary „Studenskaj Trybuny" my skazali, što ū sensie palityčnych aspiracyjaū my staim na platformie aktu 25 ha sakavika 1918 h. heta znača—ideałam našym jość Volnaja i Niezaležnaja Biełaruś uva ūsich jaje etnohrafičnych hranicach. Akt 25 ha sakavika—heta-ž vyražeńnie voli i asnaūnych žadańniaū biełaruskaha narodu, jość jon paćvierdžańniem žyćciovaj praūdy—indyvidualizacyi biełaruskaha narodu. Dziela zachavańnia svajej indyvidualnaści biełaruski narod musić zdabyć palityčnuju niezaležnaść.

Na žal, nia ūsio biełaruskaje studenstva viedaje ab hetaj praūdzie. I heta zusim zrazumieła. Bieł. stud. žyćcio — heta-ž adbitak žyćcia i padziejaū starejšaha biełaruskaha hramadzianstva, jano jość refleksam biełaruskaha ruchu ahułam.

U biełaruskim ruchu, dziakujučy histaryčnym i hieohrafičnym umovam,—dziakujučy, skazać-by bufernamu pałažeńniu biełaruskaha narodu, hdzie stykajucca dźvie mahutnyja kultury i cyvilizacyi—Uschod i Zachod,—u biełaruskim ruchu, paūtarajem, ad samaha pačatku, u sensie palityčnym, znachodziać miejsca try asnaūnyja kirunki, try arjentacyi, imienna: *maskoūska-biełaruski, polska-biełaruski i čysta biełaruski.* Pieršyja dva kirunki apirajuć realizacyju svaich palityčnych imknieńniaū na čužych siłach (Maskva, Varšava), jakija, praūdu kažučy bolš zainteresavany ū asłableńni biełaruskaha narodu i jahonych imknieńniaū, čym u pomačy dla hetaha-ž biełaruskaha narodu. Treci kirunak — biełaruski arjentujecca na svoj narod, budzić jaho z doūha-viakovaj śpiački, niščyć u im zakaranieūšuju viakami psycholohiju niavolnictva, rodzić u im nacyjanalnuju ambicyju i honar—i hetym samym tvoryć siłu, na jakoj apiraje svaje niezaležnickija imknieńni. Aproč hetaha, apirajecca jon na družbie pakryūdžanych z boku silnych hetaha śvietu narodach. Hety kirunak, panašamu, pravidłovy. Jon-ža maje adbitak u akcie 25-ha sakavika.

U zaležnaści ad času, polityčnaj konjunktury i ahulnych tendencyjaū, hetyja kirunki mianiajuć svaju siłu. Jasnaja reč, paskolki histaryčnyja, palityčnyja i hieohrafičnyja ūmovy žyćcia našaha biełaruskaha narodu niaźmieniacca, hetyja kirunki buduć u biełaruskim ruchu tryvać.

Ad časoū Hramady nabiraū siły i značeńnia kirunak maskoūska-balšavicki. Siahońnia taksama hipnoza Hramady jašče tryvaje ū biełaruskich huščach. Apošnija antybiełaruskija padziei ū B.SSR peūnie-ž vykličać u biełaruskich huščach z hramadaūskim maskoūska-balšavickim hipnozam adpaviednuju reakcyju i ćviarozaść. Siarod biełaruskaha studenstva hety kirunak, z małym vyniatkam, nia mieū i tymbolš ciapier nia maje posłuchu. Dokazam hetaha—Biełaruski Studenski Sajuz u Vilni (i ABSA — Abjednańnie Biełaruskich Studenskich Arhanizacyjaū), jaki trymajecca, pamima svajho radykalizmu, niezaležnickaj linii i ū hetym sensie pakryvajecca z trecim—biełaruskim kirunkam. Druhi kirunak — biełaruska-polski— prosta čuć vegetuje. Siarod biełaruskaha studenstva jon znachodzić posłuch tolki ū tak zvanych konjunkturystaū, dokazam čaho – skompromitavanaja daščentu Kl. Scorynia.

Treci kirunak u sučasnaści nabiraje siły. Studenstva biełaruskaje, z małym vyniatkam, jaho trymajecca.

Voś bolš mienš ahulny narys palityčnych tendencyjaū u biełaruskim ruchu i ich adbitak u biełaruskim studenstvie.

Niezaležnaje biełaruskaje hramadzianstva i studenstva, vykonvajučy svaju pryhožuju i histaryčnuju rolu, asabliva siahońnia, kali pieražyvajem ciažkija i pierałomnyja časy, pavinna vykazać hart ducha i siłu pierakanańniaū, pavinna skonsolidavać svaje nacyjanalnyja i niezaležnickija siły. A studenstva biełaruskaje ū asobnaści pavinna ab hetym pamiatać, —kab naležna vykanać svajo histaryčnaje pasłańnictva pierad Baćkaūščynaj— Biełarusiaj!

Tavarystva Pryjacielaū Biełarusaviedy ab źmienie biełaruskaj hramatyki ū B.S.S.R.

21-ha i 28-ha studnia sioleta ū T-vie Pryjacielaū Biełarusaviedy pry Vilenskim Universytecie Dr. J. Stankievič pračytaū navukovy referat ab źmienie hramatyki biełaruskaje movy, katoruju abviaściła 28-ha žniūnia 1933 h. maskoūskaja ekspozytura ū Miensku, t. zv. Rada Narodnych Kamisaraū B. S. S. R.

Referat 21-ha studnia byū paśviačany razhladu źmienaū, zroblenych u biełaruskaj movie dekretam z 28 VIII 33 h. Na pačatku lektar skanstatavaū, što choć dekret pravodžanyja im źmieny ū biełaruskaj movie nazyvaje reformaju pravapisu, zapraūdy my majem dzieła z źmienami nia tolki pravapisu, ale i hramatyki (23 źmieny hramatyčnyja i pravapisnyja adnačasna i adna źmiena tolki pravapisnaja). Zaciemiūšy ab pratestach u Zachodniaj Biełarusi, jakija vyklikaū dekret ab źmienie hramatyki, lektar pamiž inšym zaznačyū, što dziela aceny dekretu, jak ničoha supolnaha nia majučaha z navukaj, možna abyścisia i biez filolohičnych dovadaū. Kali adnak chto pryvodzić filolohičnyja arhumenty, dyk pavinien mieć niekatoraje panaćcie ab filolohii. Tymčasam tak zvanaje Biełaruskaje Navukovaje T-va ū Vilni vyniesła susim dobry pratest, ale ū takoj redakcyi, katoraja vykazvaje filolohičny analfabetyzm jahonych aūtaraū. Prykłady: u takich formach, jak чытаньне, padvojnaje н —pavodle „navykovaha" pratestu — paūstała z чытаньje upadabnieńniem н da j, tymčasam zapraūdy naadvarot—z upajabnieńnia j da н. U čužych słovach, dak унiвэрсытэт, прoфэсар, majem dzieła z ćviardym zyčnym pierad э, a nie z ćviardym э, jak dumajuć aūtary pratestu. U kančatku y rodnaha skłonu adzinočnaha liku, prykładam НЯМА ПЯСКУ, majem dzieła z formaju, abo z morfolohijaj, ale nie z fonetykaj. U kancy svajho pratestu Navukovaje T-va zvaroćvajecca da niezaležnych učaśnikaū Akademičnaje Konferencyi ū Miensku 1926 h. z zaklikam pryłučycca da jaho pratestu. Ale trudna navukovym učaśnikam konferencyi pryłučycca da pratestu takoj redakcyi.

Dalej lektar krychu daūžej zadzieržyvajecca na abaronie źmieny z 28.VIII.33 h. biełaruskaje hramatyki hr. S. Paūłovičam i ananimnym aūtaram „Летапiсу". Razhladaje ich razam, bo jany zhadžajucca pamiž saboj. Abodva abarońniki maskoūskaj reformy apirajucca ū svajoj abaronie na aūtorytetach, katorych sami nie pryznajuć i navat nia znajuć. Aporaju im nia moža być i Akademičnaja Konferencyja ū Miensku ū 1926 h., bo jaje ciapierašnija „reformatary" pravilna pryznajuć praciūnaj sabie. Akademičnaja Konferencyja, pavodle ich, była „złotam fašystych". Aūtar artykułu ū „Летапiсе" paklikaūsia na prajekt reformy pravapisu Jazykaviednaha Instytutu Biełaruskaj Akademii Navuk z 28 červienia 1933 h., z katorym pavodle słoū „letapisnaha" anonima kamisarski dekret ab źmienie biełaruskaj hramatyki „blizu što zusim zychodzicca." Lektar pakazuje, što aūtor „letapisnaha" artykułu prosta skazaū niapraūdu, bo prajekt Instytutu ū dźvioch trecich zusim roźnicca ad dekretnaj „reformy."

Dalej lektar pierachodzie da samoha dekretu i navukova raźbiraje praviedzienyja im źmieny, jak na dałani pakazyvaje ūsiu ich z hledzišča biełaruskaje movy niapravilnaść i škodnaść. Naprykład viedamaha balšavickaha pavadyra, pavodłe dekretu, možna nazvać Trockim, ale zamak u Trokach, voziery tam-ža, karaimaū, ahurki i inšyja nia možam hetak nazyvać, ale treba zvać parasiejsku — trokcki zamak, trokskija voziery i h. d.

Usie zroblenyja dekretam źmieny biełaruskaj hramatyki hruba narušajuć hałoūnyja asablivaści biełaruskaje movy; usie hetyja źmieny zbližajuć, a časta zusim utassamlajuć biełaruskija hramatyčnyja asablivaści z adpaviednymi asablivaściami movy rasiejskaje. Dekret nia tolki nie palahčyū narodnym masam i škole vučeńnie biełaruskaj piśmiennaści, ale naadvarot — stvaryū u hetym vializarnyja pieraškody, bo kab navučycca havaryć i pisać pabiełarusku, pavodle źmienienaje hramatyki, treba ūpierad u vialikaj miery navučycca parasiejsku. Adzinaj metaj reformy jość rusyfikacyja.

U dyskusii siabry T-va zhadžajučysia z lektaram padčyrkivali jašče ad siabie niapravilnaść i škodnaść dekretnych źmienaū biełaruskaj hramatyki i ich vyłučna rusyfikacyjny charaktar.

Za abaronu dekretu vystupili tolki dva hości T-va. Adzin z ich kazaū ab usim, uspaminaū Madryt i Bucharu, ale ničahusieńki nie kazaū ab samaj reformie. Jon zaklikaū T-va być tolerantnym da „refarmataraū." Za heta dastaū ad lektara dobry adkaz, što niachaj z svaim zaklikam źvierniecca da maskoūskich aūtoraū „reformy," bo nie biełarusy ich za „reformu" sadziać u turmy, mučajuć, vysyłajuć na Sałoūki i h. p., a jany heta robiać z biełarusami za toje, što hetyja nia mohuć pryznać ichniaje „reformy."

Hr. S. Paūłovič kazaū ab patrebie reformy naahuł, chočačy stvaryć uražańnie ab patrebie „reformy" praviedzienaj maskoūcami 28.VIII.33 h. Baraniū tak-ža hr. Paūłovič ananimnaha abarońnika ū „Летапiсе" maskoūskaje „reformy."

Referat lektara 28.I.34 h byū paśviačany razhladu baraćby biełarusaū u BSSR. proci nakidańnia im siłkom maskoūcami sfalšavanaj biełaruskaj hramatyki. Pavodle słovaū aūtoraū reformy i ichnich słuhaū biełaruskija kamunisty ū BSSR. „padniali „vyćcio, hałašeńnie, kryk," prajavili „šalonuju złość" proci abaźviečanaj maskoūskimi šovinistymi hramatyki biełaruskaje movy.

Navukoviec

Św. P. P. PIARŠUKIEVIČ

Dnia 4 ha śniežnia m. h. u vioscy Papłavoch, Niehnievickaj hminy, Navahradzkaha pavietu, pamior Piatro Piaršukievič, siabra Biełaruskaha Studenskaha Sajuzu pry U. S. B. u Vilni, student 4 ha kursu matematyčna-pryrodaznaūčaha fakultetu.

Karotkaje žyćcio našaha siabry — heta baraćba za lepšaje zaūtra Biełaruskaha Narodu.

Radziūsia ū sialanskaj siamji ū 1910 hodzie ū Papłavoch. Buduči vučniam Navahradzkaj Biełaruskaj Himnazii vyznačaūsia, jak adzin z najlepšych matematykaū. Hramadzkuju pracu raspačaū jašče ū himnazii. Z vialikaj achvotaj horniecca da arhanizavańnia kancertaū i pradstaūleńniaū u vakolicach Navahradku. Pieršyja Jaho pačynańni spatkała samachadovaja katastrofa, u jakoj Jon faktyčna i padarvaū svajo zdaroūje. U vosieni 1930 h. pastupiū u Vilenski Universytet, dzie vučyūsia da 1933—34 akademickaha hodu. Z pačatku 3-ha kursu pačynajecca ūžo systematyčnaje praca siabry Piatra na vioscy na kulturna-aśvietnaj nivie. Jak haračy adradženiec, z vialikaj achvotaj i pačućciom hramadzkaha abaviazku vyjaždžaje z inšymi siabrami ū śniežni 1932 h. ū Biełastoččynu, dzie praz uvieś čas Kaladnich vakacyjaū čytaje referaty ū hurtkoch T.B Š., vykładaje matematyku i fizyku na sarhanizavanych viačernich zaniatkach dla darosłych, prymaje aktyūny ūdzieł u ładžańni pradstaūleńniaū u Biełastoku. Nia hledziačy na paharšeńnie zdaroūja, Jon nie škaduje enerhii i ūsimi siłami starajecca padzialicca zdabytaju viedaju z svaimi bratami— siarmiažnikami. Pierad vyjezdam u Biełastoččynu s. Piatro byū vybrany ū kancy listapada taho-ž hodu ū Urad Bieł. Stud. Sajuzu, dzie praz uvieś 1932 33 akademičny hod spaūniaū funkcyju sekretara.

Letnija vakacyi 1933 h. — heta peryjad najbolšaha napružańnia pracy siabry Piatra, heta apošniaja, ale najvialikšaja Jaho zasłuha na hruncie pašyreńnia aśviety i mastactva siarod sialanstva. Dziakujučy Jamu tolki ūzvarušylisia dramaūšyja vioski Niahnievickaj, Ščarsoūskaj i Karelickaj hminaū. Pamima biazupynnych pieraškod i vialikich trudnaściaū na rožnym kroku, Jon za adno leta zdoleū sarhanizavać bolš 6 cioch pradstaūleńniaū i 8-mi referataū ad imia Bieł. Stud. Sajuzu. Tut my bačym Jaho, jak prelehenta, artysta, režysora, dekaratara i h. d. Ab zainterasavańni i karyści hetaj pracy śviedčyć mnoha-ličnaja prysutnaść sialanstva na referatach i spektaklach.

Čujučysia vielmi słabym na zdaroūi i dziela materjalnych pryčyn, zvolniūsia siabra Piatro na hod z universytetu. Adnak nia moh zharnuūšy ruki spakojna adpačyvać. Nadnarmalnymi vysiłkamj złpredziū siabra Piatro jašče pradstaūleńni u v. Ščorsach i v. Zapolli.

Z miłaj uśmieškaj, z viečnym humaram i badzioraściu staić pierad nami hety małady adradženiec i baraćbit,i, zdajecca, čujucca słovy, jakija Jon časta paūtaraū:

„...I budzie ūnukam panavańnie.
Tam, dzie siahońnia płača dzied."

Pachavany siabra Piatro na Niehniavickich mohiłkach. Chaj budzie pucham dla Ciabie, Darahi Piatro, rodnaja ziamielka. A Tvaja baraćbianaja i achviarnaja służba dla spravy Adradžeńnia Svajho Narodu chaj budzie prykładam dla ūsich Biełarusaū!

A. S.

Chronika.

— U Vilni nadoviačy vyšaū pieršy numar časopisi p z. „Biełaruś pracy," aficyjalnym redaktaram i vydaūcom jakoj jość student-biełarus k. S. Saroka. Z hetaha numaru časopisi možna atrymać uražańnie, što k. S. Saroka — jak-by inśpiravany čužoj varožaj da biełarusaū rukoj — choča ū svajej biezhraničnaj zarazumiełaści raspačać novuju eru ū biełaruskim ruchu, — choča ū im pravieści sanacyju i stvaryć biełaruski pozytyvizm. Da dasiulešsiaj pracy i zdabytkaū u biełarusaū adnosicca jon z poūnaj negacyjaj, a ūsiamu dasiulešniamu biezhałoūju ū biełaruskim ruchu „vinavaty" pavadyry hetaha ruchu, a nia silnyja hetaha śvietu, a kali chodzić ab polskija ūłady, to jany, aproč kolišnich endeckich Hrabskich i Dmoūskich,—jak z časopisi vidać,—całkom Sarokaj apraūdany!

U tymža numary časopisi znachodzim šmat zapalnych słoū, frazeolohii, histeryčnaha kryku. Numar hety jość dokazam ignorancyi praūna-palityčnaha pałažeńnia biełarusaū u Polščy, abjavam nierazumieńnia patreby konsolidacyi biełaruskich siłaū, naadvarot jość ich raściarušyvańniem, —dalej jość jon anarchičnym vybucham niepačytalnaha ū sensie polityčnym i zarazumiełaha studenta, urešcie jość bukietam i polityčnym reveransam pierad polskimi ūładami, za što hetyja ūłady pavinny byli-b Saroku „dobrze vynagrodzić." Dobra toje, što k.S. Saroka ū svajej hetkaj „pracy", jak daviedvajemsia, jość z boku niezaležnaha biełaruskaha studenstva adzinokim, a Skarynincy, peūniež, mohuć jaho namu vystupleńniu, kali nie zajzdrościć, to prynamsia aklaskivać!...

Redakcyjnaja Kalehija „Studenskaj Trybuny" — u składzie kal. kal.: M. Tatarynovičanka, J. Šutovič i J. Malecki
Sekretaryjat „Stud. Trybuny" čynny kožnuju niadzielu miž 11—12 hadz. pry vul. Zavalnaj 1—1.

Redaktar: Jan Paźniak Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 3. Wydawiec: A. Šutowič